Нядзеля Хрыста, Валадара сусвету

Аўтар: Рэдакцыя
16.11.2012 01:00



З Евангелля св. Яна

Пілат спытаўся ў Езуса: “Ты Кароль юдэйскі?” Езус адказаў яму: “Ці ад сябе ты кажаш гэта, ці іншыя сказалі табе пра Мяне?” Пілат адказваў: “Ці ж я юдэй? Твой народ і першасвятары выдалі Цябе мне. Што Ты зрабіў?” Езус адказаў: “Валадарства Маё не з гэтага свету. Калі б з гэтага свету было Маё Валадарства, то слугі Мае заступіліся б за Мяне, каб Я не быў выдадзены юдэям. Але цяпер Маё Валадарства не адгэтуль”. Пілат сказаў Яму: “Значыць, Ты Кароль?” Езус адказаў: “Ты кажаш, што Я Кароль. Я для таго нарадзіўся і для таго прыйшоў на свет, каб засведчыць аб праўдзе. Кожны, хто ад праўды, слухае голас Мой”. †

Ян 18, 33б-37

Цяжкае валадаранне

Дзіўна – Пан Езус, хоць Ён у кайданах, пад пагрозай прысуду страшнай смерці, прыніжаецца да дыялогу з Пілатам. Ён – Валадар неба і зямлі – вядзе размову з рымскім служачым. Можа, Пілат і паходзіў з вышэйшага чыноўніцкага рангу, таму што ад імя цэзара кіраваў кавалкам Імперыі, але быў усяго толькі служачым, якога імператарскі капрыз мог адклікаць з пасады адным словам, адным дакументам. Пілат валодаў кавалкам Імперыі, якая ўжо тады праяўляла сімптомы ўпадку. Езус даваў сведчанне аб валадарстве незнішчальным, вечным. І Яго ўлада расцягвалася (і сягае далей!) да самых далёкіх межаў сусвету. Несуразмернасць паміж Пілатам і Асуджаным настолькі ўразлівая, што здаецца неверагоднай! А аднак, малы, самаўпэўнены Пілат паслаў Валадара сусвету на страшную смерць. І што яшчэ больш ашаламляльна – Валадар сусвету прыняў гэты прысуд!

У кожным нашым доме ёсць крыж – бачны знак драматычных вынікаў сустрэчы Езуса з Пілатам. Крыжы мы ставім на нашых дарогах. Ці задумваемся мы часам над сэнсам прысутнасці крыжа ў нашым жыцці? Іншымі словамі, наколькі праўда, аб якой сведчыў Езус, становіцца фундаментам нашага жыцця?

Кс. Яраслаў Грынашкевіч